**НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ**




# КНІГА ДЛЯ СПЕВАЎ

**У гродзенскім выдавецтве «ЮрСаПрынт» убачыў свет зборнік песень вядомага гродзенскага кампазітара Валерыя Кручкова на словы не менш вядомай беларускай паэтэсы з Гродна Людмілы Кебіч. Кніга называецца «Беларусь – маё натхненне».**

***

Кручкоў Валерый Міхайлавіч – творча адораны музыкант і кампазітар, улюбёны ў свой горад і краявіды роднага Краю. Менавіта гэтай тэматыцы прысвечана найбольшая колькасць яго твораў. Праз іх кампазітар-патрыёт найбольш поўна і яскрава выказвае любоў да малой і вялікай Радзімы. Шматлікія зборнікі песень сведчаць пра тое, што Валерый Міхайлавіч надае вялікую ўвагу аўтарам Прынёманскага краю – пішa шмат твораў на словы гродзенскіх паэтаў і не толькі членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, але адшуквае слушныя песенныя тэксты ў глыбінцы. Яго песні карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод вакальна-харавых калектываў і салістаў, з якімі ён актыўна, паспяхова і плённа супрацоўнічае.

У новы зборнік «Беларусь – маё натхненне» ўвайшлі песні на словы вядомай беларускай паэтэсы Людмілы Кебіч, з якой Валерый Міхайлавіч супрацоўнічае шмат гадоў. Песні гэтага творчага дуэта гучаць на розных пляцоўках горада, вобласці і рэспублікі, выклікаюць захапленне і адпаведныя пачуцці. Спадзяёмся, што новыя песні падхопяць прафесіянальныя і аматарскія калектывы і салісты, і яны шырокай музычнай хваляй разальюцца па нашай сінявокай старонцы.

*Прадмова-анатацыя*